Цэна асобнага нумэру 5 кап.

# НАША НІВА

Выходзіць што тыдзень.

Адрэс рэдакціі і адміністрацыі: Вільня, Віленская вул., № 29.

Цэна с перасылкай і дастаўкай на 1 г.—2 р. 50 к., на 6 мес.—1 р. 25 к. на 3 м.—65 к., на 1 мес.—25 к. За граніцай: на 1 г.— 4 р. на 6 мес.—2 р. мес.—1 р. Перамена адрэсу— 20 кап.

Абвесткі прыймаюцца на апошняй страніцы па 20 кап. за лінейку малымі літэрамі Рукапісы і карэспандэнціі, прысланые у рэдакцію, павінны быць чытэльна напісаны с праўдзівай фаміліей і адрэсам таго, хто яе прысылае. Можна такжэ падпісаць прозвішчэ разам с фаміліей, хто не захочэ каб была надрукавана праўдзівая фамілія. Адрэс і фамілія тольні для ведама рэдакціі. Рэдакція пакідае за сабой права папраўляць і укарачываць прысланые рукапісы і аўторам назад іх не звертае.

Год X. | 25 Чэрвеня 1915 г. | № 25

*Просімо п.п. Падпішчыкоу „Нашай Нівы“, каторые надпісаліся тольні на першую палавіну 1915 г., парупіцца аднавіць падпіску, каб не было перарыву у высылцэ газэты.*

## Перад аткрыцьцем Гас. Думы.

Калі йшлі выбары дэпутатоў у чацьвёртую Гасударственую Думу, ніхто, бадай, ня думаў, якая вялікая і цяжкая работа ляжэ на іх плечы. Партіі змагаліся між сабой, жадаючы выбраць с в а й г о чэлавека, не ўважаючы на тое, што ён будзе варт у Думе, як прэдстаўнік народу, як заступнік яго ва ўселякіх крыўдах... А селяне нашы дык глядзелі на дэпутацтва найболей як на «добры заработак»: былі такіе здарэньня, што кандыдат у дэпутаты згаварываўся з сваімі выбаршчыкамі, што з дэпутацкай пэнсіі будзе даваць частку ім...

Якіх паслоў выбіралі, такіх і маемо... Паехалі нашы «Янкі ды Сымонкі» ў Піцер, дзержучыся за полы «сваіх паноў» — з гузікамі ды бяз гузікоў, а ў Думе паселі ў куточках

Ды толькі і чулі аб іх!

Усё было добра у спакойны час. Сядзелі гэтые «заступнікі» нашы, ды толькі чакалі, калі скончыцца іх дэпутацтва, калі можна будзе вярнуцца да хаты — з грашыма ў кішэні. Ажно наляцела вайна і ўскалыхнула ўсё жыцьцё старонкі. Цяжка прышлося народу: хто дуж — пайшоў у армію, а тые, хто астаўся, прымушэны рупіцца аб тое, каб салдат быў сыты, адзеты, абуты. Прымушэны рупіцца, каб сем'і запасных, астаўшыся без работнікоў у хаці, ўсё-ж тыкі здалелі вырабіць зямлю і сабраць ураджай, каб раненые ваякі мелі помач лекарскую і прытулак. А каб жэ гэта усё зрабіць, трэба, каб народ пазнаў, кудой ісьці, за што ўзяцца. Трэба, каб яму паказалі д а р о г у.

Шукаючы дарогі, ўсе вочы звертаюцца на Думу. Зусюль чуцен адзін голас: і фабрыканты, і купцы, і земскіе працаўнікі, і гарадзкіе думы — ўсе кажуць, што трэба чым хутчэй склікаць Гасударственую Думу,

А гэтымі днямі апублікованы быў рэскрыпт Гасудара Імператара на імя прадседацеля рады міністроў, Горэмыкіна, у каторым сказана, што Дума будзе склікана не пазьней аўгуста месяца.

Газэты пішуць, што цяпер Дума будзе заседаць даўжэй, чым тые разы, калі працавала яна ўсяго па тры дні... Пішуць, што яна павінна разглядзець шмат дужа важных справ,

. — А тым часам, як падумаеш, каго мы выбіралі ў дэпутаты, дык робіцца на душы дужа цяжка й сумна: што здалеюць зрабіць н а ш ы «выбранцы»? Як споўняць у такі цяжкі час сваю павіннасць людзі, думкі каторых былі заняты заўсёды толькі аднэй справай: лёгкім заработкам?..

Г. Б.

## ВАЙНА.

**На Усходнім фронце. (Весткі ад Штабу Вярхоўнаго Глаўнакамандуючаго).**

*17 чэрвеня.* «15 чэрвеня атрад нямецкіх караблёў, ў саставі аднаго броненосца берэгавой абароны, чатырох лёгкіх крэйсероў і некалькіх міноносцоў, абстрэляў віндаўскі порт (прыморская крэпасьць. Р э д.) і зрабіў пробу высадзіцца на берэг, каторая была адбіта. Адзін непрыяцельскі мінаносец узарваўся на мінах загароды. Нашы мінаносцы ўступілі ў гарматнюю бітву з непрыяцельскімі крэйсерамі і мінаносцамі, прыкрываўшымі ваенны рух проці Віндавы с поўначы, і прымусілі іх к атступленьню.

Ў Шавэльскім районі, на Нёманскім і Нарэвскім фронтах і на левым беразі Віслы заціпшэ. Наступленьне непрыяцеля паміж рэкамі Вепжэм і Бугам, на фронце Замосьце—Сокаль, не спыняецца. На Захаднім Бугу і Гнілой Ліпе 15 і 16 чэрвеня мы карысна адбілі некалькі непрыяцельскіх атак, прычым, выкрыўшы перэправу непрыяцеля цераз Днестр каля Галіча, перайшлі ў наступленьне і захапілі некалькі сот палонных».

*18 чэрвеня.* «Наступленьне непрыяцеля паміж рэкамі Вепж і Буг не спынялося, прычым 16 чэрвеня больш заўзятые ар'ергардные (задніх атрадоў. Р э д.) бітвы адбываліся на шассэ Томашов — Замосьце і на шляхах к Сокалю. Ў Галіччыні непрыяцель у працягу 16 і першай палавіны 17 чэрвеня вёў заўзятые атакі на розных участках фронта ад Каменкі да Галіча. Усе атакі адбіты. Праціўніку зададзены вялікіе страты, узята да 1000 палонных. Толькі на некаторых участках непрыяцелю удалося утрымацца на некалькіхсот шагоў перэд нашымі акопамі. На іншых фронтах зусім заціпшэ».

*19 чэрвеня.* «Днём 17 чэрвеня к поўначы ад Прасныша і ў наступіўшую ноч у районах Шаўлі і Раціонжа мы адбілі аддзельные атакі немцоў. На левым беразі Віслы непрыяцель днём 18 чэрвеня вёў безкарысные атакі на фронт Сенно — Юзэфов. На Люблінскім напрамку непрыяцель вядзе стычкі з намі ўдоўж рэк Вышніцы і і Пор. Паміж Вепжам і Бугам праціўнік пасовываецца ў паўночным паўночна-усходнім напрамках. 18 чэрвеня ў районі к поўначы ад Замосьця адбываліся заўзятые ар'ер гардные бітвы. Адзін с прускіх гвардзейскіх палкоў, захапіўшый вёску Жуков, быў выбіты з яе нашай проці-атакай. На фронце Сокаль — Галіч непрыяцель 17 чэрвеня і ў першую палавіну дня 18 чэрвеня вёў многачысленые атакі, большай часьцю адбітые намі з вельмі цяжкімі стратамі для непрыяцеля. У часі нашых проціатак мы захапілі больш за 2000 палонных і некалькі кулемётоў. Аднак с поўдня ад Рогаціна значным нупрыяцельскім сілам удалося к вечэру 18 чэрвеня умацавацца на левым беразі рэкі Гнілой Ліпы. На Днестры без перамен».

*20 чэрвеня.* «Непадалёк ад вострава Готланда брыгада нашых крэйсероў вела бітву с 5-цю нямецкімі крэйсерамі, у ліку якіх быў броненосны крэйсер «Роон». Рэзультатам бітвы было сільнае ушкоджэньне аднаго з нямецкіх крэйсероў, каторы быў змушэны выкінуцца на беразі вострава, і пасьпешные ўцёкі рэшты. Пагоня за непрыяцелям адбывалася больш гадзіны.

Ночай і днём 19 чэрвеня непрыяцель вёў многачысленые аддзельные атакі к захаду ад сярэдняго Нёману, па ўсім фронце рэкі Шэшупы, Бобры, каля Осовца, на правым беразі Віслы, каля Старожэбы, к паўдню ад Піліцы, на Радомскім напрамку, а такжэ каля Пакослава і Сенно. Непрыяцелю удалося толькі ў районі Кальварыі захапіць на невялікім прасьцягу нашы пярэдніе акопы. 19 чэрвеня не спыняліся заўзятые бітвы на р. Пор і к поўначы ад Замосьця. У іншым без перамен.

На Чорным моры адна з нашых падводных лодак ў районі угольным зніштожыла тры параходы, адзін вялікі парусны баркас і некалькі парусных шхун і барак. Нашы мінаносцы карысна абстрэлівалі Зунгулдак».

*21 чэрвеня.* «19 червеня пры ўходзе ў Данцігскую бухту, англіцкая падводная лодка ўзарвала дзьвумя мінамі нямецкі карабль тыпу «Дэйтшлянд», ішоўшый першым у эскадры. Адзін з нашых мінаносцоў тараніў (наехаў) нямецкую падводную лодку пры яе пробі падыйці к нашым караблям. Лодка на верх не паказывалася. Мінаносец мае невялікіе ушкоджэньні.

У Шавэльскім районі і к захаду ад Нёману бітвоў не было. Ў районі Едвабно не спыняецца заўзятая мінная барацьба. Каля вёскі Кучэ мы захапілі непрыяцельскую мінную галлерею, гдзе знайшлі 22 пуды дынамінуту, і узарвалі заложэный намі горн. На Бзуры, каля вёскі Сула, адбіта проба непрыяцеля прыбліжыцца к нашым акопам. На Радомскім напрамку наша войска, перайшоўшы ў ночы на 20 чэрвеня у аддзельнае наступленьне, захапіла акопы некалькіх аўстрыяцкіх батальёноў. Паміж Віслай і Бугам 19 і 20 чэрвеня вяліся страшэнна заўзятые бітвы. Наступленьне непрыяцеля па рэчцы Выжніцы было намі карысна стрымана. Глаўны напор непрыяцеля скераваны быў на ўсход ад горада Красніка, у напрамку на Быхов, гдзе яго атакі у ночы на 20 чэрвеня намі адбіты, але рэзультат бітвы яшчэ не абазначыўся. Непрыяцель такжэ меціцца прасунуцца на напрамках Замосьце—Красностав, гдзе найбольш заўзятые бітвы вечэрам 19 чэрвеня і раніцай 20 чэрвеня адбываліся ў районі ўплыву рэчкі Воліцы ў Вепж на лініі сёл Тажымехі — Красное--Стрыев. Вёска Тажымехі, захопленая непрыяцелем вечэрам, раніцай 20 чэрвеня ізноў перайшла ў нашы рукі пасьля сьмелай атакі палкоў генерала Ірманова. Затрымаўшы напор праціўніка на Гнілой Ліпе, нашы ахраняючые атрады ў ночы на 21 чэрвеня ацыйшлі к Залатой Ліпе. На Днестры без перамен».

*22 чэрвеня.* «У районі Едвабно 20 чэрвеня немцы безрэзультатна ўзарвалі два горны і затым аткрылі па мейсцы узрыву заядлую атрэляніну. На другі дзень нашы мінэры карысна падарвалі нямецкую мінную галерэю, што выклікало ізноў сільную стрэляніну у непрыяцеля. На Люблінскім напрамку, непрыяцель пасьля заўзятых бітвоў 21 чэрвеня пасунуўся на фронце паміж Краснікам і рэкой Вепж. Усе атакі немцоў паміж Вепжам і Захаднім Бугам, а такжэ на апошней рэчцы між вёскай Крылов і горадам Сокаль 20 і раніцай 21 чэрвеня адбіты. Намі захоплена тут некалькі сот палонных. На Бугу вышэй Сокаля, на Залатой Ліпе і Днестры без перамен». (Пта).

**На іншых фронтах** ваенных змаганьнёў нічога вельмі важнаго не было.

## На вайне і каля вайны.

**З апошніх Львоўскіх прыказоў.** У газэці «Прыкарпатская Русь» 4 чэрвеня быў надрукованы такі прыказ: Маючы на увазі, што мужчыны, жыхары Галіччыны ад 18 да 50 гадоў могуць быць прызваны у рады аўстра-вэнгэрскай арміі у мейсцох атступленьня расейскаго войска, глаўнакамандуючы арміямі поўдзённа-заходняго фронта загадаў усіх гэткіх жыхароў, апрача жыдоў, высылаць у Валынскую губэрню пазваляючы ім браць с сабой сям'ю і усе здабыткі. А дзеля таго, паведамляю, што, хто хочэ выехаць у названую губэрню сваім коштам, можэ скарыстаць з прыдатковых паездоў, каторые будуць адходзіць с станціі Львоў—цэнтральны што-дзённа, пачынаючы с 3 чэрвеня вечэрамі. Названые асобы павінны атрымаць

